УДК [769.91.044:069.5]:069:94(476)

*М. А. БЯСПАЛАЯ*

# КАЛЕКЦЫЯ ПЛАКАТАЎ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ ЯК КРЫНІЦА ПАМЯЦІ

*Адлюстроўваюцца суадносіны вербальнай і візуальнай інфармацыі плаката з асноўнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. На падставе аналізу калекцый плакатаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны паказаны эвалюцыя асноўных ідэй і яе мастацкае ўвасабленне, актуальнасць зместу плаката адпаведным падзеям вайны.*




Да шматлікіх і разнастайных крыніц аб Вялікай Айчыннай вайне па праве можна аднесці плакаты, створаныя знакамітымі і малавядомымі мастакамі. Плакаты, якія выдаваліся па гарачых слядах, можна разглядаць як непасрэдны водгук на ваенныя падзеі. З аднаго боку, плакаты абвастралі іх успрыманне, з другога – адлюстроўвалі магчымасць вобразна-мастацкай інтэрпрэтацыі. Змест і сюжэт многіх плакатаў, якія сёння складаюць каштоўную гістарычную крыніцу, з'яўляюцца дадатковай інфармацыяй у адносінах да пісьмовых дакументаў, даюць магчымасць іх новага разумення і трактоўкі. Але ў якасці галоўнай функцыі плаката, безумоўна, можна разглядаць фарміраванне патрыятычных пачуццяў, веры ў перамогу, справядлівасць барацьбы са страшным і моцным ворагам.

Найбольш актыўна даследаваннямі плаката ваенных гадоў займаліся мастацтвазнаўцы: вывучалі формы, мастацкія сродкі выяўлення, агульныя тэндэнцыі развіцця мастацтва плаката і інш. Поўнае і грунтоўнае даследаванне гэтай праблематыкі ў айчынным мастацтвазнаўстве ажыццёўлена А. Г. Галубовіч у дысертацыі на тэму «Искусство социально-политического плаката Беларуси XX века (эволюция, стилистика и те-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матыка)» [1]. У адным з параграфаў работы разглядаецца плакат у перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

*Мэтай* нашага *даследавання* з'яўляецца тэматычны і параўнальна-гістарычны аналіз плакатаў ваеннага перыяду дзеля сучаснага асэнсавання падзей вайны і іх візуальнага і вербальнага адлюстравання. Аб'ектам вывучэння сталі 418 плакатаў з калекцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У ёй прадстаўлены ўсе асноўныя віды і формы плаката перыяду вайны. Калекцыя фарміравалася з падарункаў буйнейшых музеяў Масквы і Санкт-Пецярбурга – Дзяржаўнага гістарычнага музея, Цэнтральнага музея Узброеных Сіл РФ, Цэнтральнага ваенна-марскога музея і інш. Частка плакатаў была куплена ў калекцыянераў, некаторыя былі перададзены музею самімі аўтарамі. У 2010 г. музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выдаў каталог калекцыі плакатаў пад назвай «Родина-мать зовет! Плакаты Великой Отечественной войны» [3].

Безумоўна, такі від мастацтва і адначасова нагляднай агітацыі ўзнік намнога раней XX ст. Адна з першых звестак аб выкарыстанні плаката на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага адносіцца да часоў паўстання. У выглядзе плаката ў чэрвені 1794 г. быў надрукаваны і разасланы ў паветы «Паланецкі ўніверсал» Тадэвуша Касцюшкі [2, с. 118]. Першы плакат на беларускай мове пад назвай «Плакат краёвай выставы» быў створаны ў 1913 г. Фердынандам Рушчыцам.

У гады Першай сусветнай вайны агітацыйныя плакаты атрымалі шырокае распаўсюджанне. Іх тэматыка была дастаткова шырокай – заклікі падпісвацца на ваенныя пазыкі, дапамагаць параненым і г.д. Найбольш нагляднымі і зразумелымі для малаадукаванай салдацкай масы і простага працоўнага люду сталі плакаты, выкананыя ў манеры народнага лубка. За першыя чатыры месяцы вайны было выпушчана больш за 20 найменняў лубка вядомымі мастакамі – К. Малевічам, У. Маякоўскім, Ф. Бурлюком і інш. [1, с. 7].




Наступны этап развіцця плаката звязаны з падзеямі грамадзянскай вайны, калі з'явіліся і сталі надзвычай папулярнымі «Окна сатиры РОСТА». Міжваенны перыяд таксама даваў шматлікія сюжэты для плакатаў. У музейнай калекцыі знаходзяцца дастаткова выразныя ўзоры як тагачаснай ідэалогіі, так і мастацтва, якія, на наш погляд, не маюць патрэбы ў каментарыі.

На пачатак Вялікай Айчыннай вайны мастакі-плакатысты адазваліся творамі сугучнай тэматыкі. На працягу тыдня было падрыхтавана да 50 плакатных лістоў, пяць з іх адразу выйшлі масавымі тыражамі. Да вечара 22 чэрвеня Кукрыніксы падрыхтавалі эскіз плаката «Беспощадно разгромим и уничтожим врага!», які быў 24 чэрвеня размешчаны ў газеце «Правда».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




Надзвычай экспрэсіўна і сітуацыйна дакладна адлюстраваны галоўны момант пачатку вайны, звязаны з парушэннем савецка-германскага дагавора 1939 г. аб ненападзенні, і выказана ўпэўненасць у разгроме ворага. Гэты першы плакат Вялікай Айчыннай вайны шмат разоў перавыдаваўся і не толькі ў Савецкім Саюзе, але і ў іншых краінах антыгітлераўскай кааліцыі.

Самы знакаміты, шырокавядомы, эмацыянальна ўзнёслы і глыбока патрыятычны плакат часоў вайны – «Родина-мать зовет!» (І. Таідзе). Ён выдаваўся мільённымі тыражамі на мовах усіх народаў СССР. Галоўная знаходка мастака ў стварэнні абагульняючага вобраза Маці-Радзімы ў выглядзе жанчыны з характэрным народным тварам, пранізлівым поглядам, выразнымі жэстамі. Важным было і тое, што тэкст ваеннай прысягі чытаўся вельмі лёгка і галоўная ідэя плаката была зразумела кожнаму.




Экспрэсія, вобразная выразнасць, прадуманасць кампазіцыі, каларыстыка вызначаюць плакаты Д. Маора «Ты чем помог фронту?», В. Карэцкага «Наши силы неисчислимы», І. Рабічава «От народной мести не уйти врагу!» і работу невядомага мастака «Защитим родную Москву».

Пералічаныя плакаты аб'ядноўваюць не толькі мастацкія і агітацыйныя якасці, плакатны пафас і манументалізм, але і ключавая ідэя, глыбокая сутнасць зместу. Яны прысвечаны важнейшым кірункам барацьбы савецкага народа з ворагам – папаўненню радоў Чырвонай арміі, арганізацыі работы савецкага тылу, разгортванню партызанскага руху і вырашальнай падзеі першага года вайны – бітве за Маскву. Адпаведна мастацказнаўчай характарыстыцы ўсе яны выдзяляюцца з агульнага выяўленчага раду.




Выява на апошнім плакаце выразна дэманструе, што сталіцу абараняў увесь народ – ад салдат, матросаў, апалчэнцаў да жанчын, што адпавядала рэчаіснасці. Абарона Масквы – гэта не толькі зацятыя змаганні за кожную часцінку роднай зямлі, але і будаўніцтва некалькіх ліній абароны, толькі адна з якіх – Мажайская – дасягала больш як 100 км, стварэнне лясных завалаў на дарогах і інш. Выява марака на плакаце мо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




жа сведчыць аб тым, што ў верасні 1941 г., калі больш-менш стабілізаваўся фронт вакол блакаднага Ленінграда, пад Маскву пачалі адпраўляць адтуль баявыя часці.

Ужо на пачатку вайны сродкамі мастацтва, у тым ліку плакатнага, пачала развівацца ідэя аб пераемнасці баявой славы. Першы плакат гэтай серыі выпушчаны Кукрыніксамі, тэкст да яго напісаў С. Маршак. У далейшым ідэя пераемнасці атрымае больш глыбокае ўвасабленне, але і першая работа вельмі выразная, сюжэт і каларыстыка прадуманыя, эмацыянальнае ўздзеянне, безумоўна, прысутнічае.

Плакаты з музейнай калекцыі можна аб'яднаць у пэўныя тэматычныя цыклы, прысвечаныя ці асноўным падзеям на фронце, ці адлюстраванню нечалавечай жорсткасці захопнікаў, ці змаганню асобных радоў войск, ці рабоце тылу. Заклікі на плакатах адпавядаюць іх мастацкаму зместу і дапамагаюць зразумець галоўную ідэю. Выкарыстаем на мове арыгінала некалькі найбольш, на наш погляд, характэрных, хрэстаматыйных – «Раздавим фашистскую гадину!», «Комсомолец, будь героем Великой







Отечественной войны!», «За Родину, за Сталина!», «Вступайте в ряды народного ополчения!», «Будь героем!», «Выше знамя Ленина – Сталина, оно несет нам победу!», «Партизаны, бейте врага без пощады», «Народ и армия – непобедимы!» і інш.

Сярод плакатаў музейнай калекцыі ёсць чатыры, якія адлюстроўваюць адну з важнейшых дыпламатычных падзей – стварэнне антыгітлераўскай кааліцыі, пачатак якой паклалі перамовы, потым адбылося заключэнне пагадненняў са Злучанымі Штатамі Амерыкі і Англіяй, а завяршыўся працэс у 1942 г. Абодва плакаты створаны ў 1941 г., і да ідылічнай карціны, як гэта паказана



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




на плакаце Кукрыніксаў «Назначили народы-братья над вражьим городом свидание…», было не толькі далёка па часе, але рэальна ўвасобіць яе аказалася фактычна немагчыма.

Да тэмы антыфашысцкага руху можна далучыць і адзіны ў калекцыі плакат «К оружию, славяне! Разгромим фашистских угнетателей!», выпушчаны ў 1941 г. дастаткова вялікім тыражом да 50 тыс. экзэмпляраў. Галоўная ідэя плаката падкрэслівае неабходнасць адраджэння славянскага адзінства ў барацьбе з агульнам ворагам.

Доўгія стагоддзі жанчыны знаходзіліся па-за межамі баявых дзеянняў, на іх долю выпадала чакаць і спадзявацца. Першыя факты ўдзелу жанчын у ваенных падзеях у якасці сясцёр міласэрнасці адносяцца да Крымскай вайны (1854–1856). Але праз паўстагоддзе, у гады Першай сусветнай вайны, праца жанчын у ваенных шпіталях, на фабрыках і заводах стала нормай. Вялікая Айчынная вайна прадоўжыла гэты працэс, і плакат яго адлюстраваў досыць выразна. Жанчына прызнавалася паплечнікам мужчын, нават з'явіўся зварот «таварыш жанчына», і быў выпушчаны плакат-калаж І. Астапава і І. Холадава пад красамоўнай назвай «Победа будет в той стране, где женщина с мужчиной наравне». Жанчын заклікалі ўступаць у рады сандружынніц, донараў, механізатараў, займаць месца мужчын на вытворчасці і г.д. Неабходна прызнаць, што жанчыны не толькі выканалі ўскладзеную на іх задачу неймавернай фізічнай напружанасці, але праявілі самыя высокія маральныя якасці ва ўсіх падзеях вайны – на фронце, у партызанскай і падпольнай барацьбе, у блакадным Ленінградзе, падчас эвакуацыі, у цяжкіх умовах працы на эвакуіраваных прадпрыемствах, у забеспячэнні арміі харчаваннем і інш. А хто можа перадаць маральныя і псіхалагічныя ўмовы прыватнага жыцця жанчын







РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

падчас вайны. Таму аўтары плаката мелі рацыю, калі звярталі ўвагу на адзінства тылу і арміі, залежнасць настрою арміі ад стану тылу.




Калекцыя ўтрымлівае тры плакаты, прысвечаныя фашысцкаму палону. Па памерах гэта невялікія лісты 50 на 30 см, два з іх без тыражу, а адзін выпушчаны ў колькасці 10 тыс. асобнікаў. Фактычна, гэта самы нязначны тыраж, прысвечаны падзеям на фронце, за ўвесь перыяд вайны. Ды і змест іх ілюстрыруе факт, які ўжо адбыўся, а заклік змагацца да апошняй каплі крыві, апынуўшыся ў акружэнні, не мог аказаць эмацыянальнага ўздзеяння ў канкрэтным баявым эпізодзе. Плакаты такога зместу не маглі падняць баявы дух салдат, хутчэй наадварот. Відавочна, што плакаты як бы канстатуюць адзінакавыя выпадкі, у іх зусім не праглядаюцца шматлікія эпізоды акружэння буйных падраздзяленняў Чырвонай арміі ў першыя месяцы вайны, калі ў палон папала неймаверная колькасць салдат, афіцэраў і нават генералаў. Сучасныя даследчыкі называюць лічбу 3,9 млн чалавек, з іх 15,2 афіцэраў. Да пачатку 1942 г. у лагерах ваеннапалонных засталося толькі 1,1 млн чалавек, астатнія загінулі ад холада, голада, хвароб.




У калекцыі ёсць два плакаты, прысвечаныя такой важнай на вайне справе, як захаванне ваеннай, ці дзяржаўнай тайны. На адным з іх выразна чытаецца надпіс ад рукі «Привет из города-героя Ленина. 25.7.42. Политрук Русланов». Супрацоўнікам музея, на жаль, не ўдалося даведацца аб гісторыі гэтага надпісу, не змагла дапамагчы і жыхарка Ленінграда, якая перадала плакат у музей. Аднак галоўны сэнс гэтых плакатаў зразумелы і, можна думаць, што з'явіліся яны невыпадкова. У якасці ілюстрацыі нагадаем здарэнне, што адбылося ў адной з 200 разведвальна-дыверсійных груп, якія дзейнічалі на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Баец Д. А. Салаўёў у размове са сваёй дзяўчынай выдаў сакрэтныя звесткі аб маючай адбыцца баявой аперацыі. Дзяўчына расказала пачутую навіну сваім родным, а хтосьці з іх прагаварыўся паліцаям. У выніку, пры пераходзе праз чыгунку партызан сустрэў моцны агонь праціўніка і яны адступілі, не выканаўшы заданне. Абставіны гэтай падзеі разбіралі на таварыскім судзе, аднак аб яго рашэнні звестак няма. Такіх здарэнняў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




справакаваных неапраўданай легкадумнасцю, назіралася нямала, таму з’яўленне падобных плакатаў было невыпадковым.

Да плакатаў, згаданых вышэй, можна аднесці работы на, здавалася б, бытавую тэматыку, тым не менш у гады вайны такія дробязі былі вельмі важнымі.

Лічым патрэбным звярнуць увагу на серыю плакатаў з калекцыі музея, якая адлюстроўвала імкненне савецкай прапаганды праз плакат актуалізаваць гераічнае мінулае, перш за ўсё рускага народа. Вышэй (с. 8) мы звярталіся да аднаго з папулярных плакатаў Кукрыніксаў з тэкстам С. Маршака «Бьемся мы здорово, колем отчаянно – внуки Суворова, дети Чапаева», выдадзенага ў 1941 г. У наступныя гады, асабліва ў 1943 г., калі пачаўся пералом у ходзе Вялікай Айчыннай вайны, з’явілася значная колькасць плакатаў, прысвечаных знакамітым героям мінулага.




Плакатныя лісты гэтай серыі лёгка чытаюцца, бо іх тэксты былі знаёмы са школьных падручнікаў. Адзначым, што плакаты як бы дапаўнялі падзею больш важнага значэння, а менавіта ўвядзення ў Чырвонай арміі новых узнагарод – ордэнаў Аляксандра Неўскага, Дзмітрыя Данскога, Суворава, Кутузава, Ушакова і Нахімава. Патрыятычныя пачуцці атрымалі своеасаблівую гістарычную падтрымку, барацьба савецкага народа з ворагам апіралася на ратную славу і перамогі славутых продкаў.

Шкада, аднак у музейнай калекцыі няма плакатаў, прысвечаных вельмі важнай падзеі, якая адбылася ў гады вайны, – наладжванню адносін паміж дзяржавай і праваслаўнай царквою. Гэты момант можна разглядаць як адзін з вырашальных у дасягненні перамогі над ворагам. Адзіным прыкладам, які ўскосна звяртае ўвагу на ўдзел царквы ў абароне радзімы, з’яўляецца рэпрадукцыя з карціны А. Дэйнэкі «Загорск 1942 года», выпушчаная тыражом



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у 10 тыс. асобнікаў. Зварот савецкага і партыйнага кіраўніцтва да рэлігійных пачуццяў народа, вытокаў духоўнасці, гераічнага мінулага знайшоў гарачы водгук у сэрцах людзей. Патрыятычны ўздым быў настолькі выразным, што, як лічаць некаторыя навукоўцы, калі б не тактычныя пралікі кіраўніцтва дзяржавы, то вайну можна было б закончыць намнога раней.




Пераважную большасць плакатаў музейнай калекцыі можна аб’яднаць у наступныя тэматычныя групы – падзеі на фронце, тыл – фронту, усенародная барацьба на акупіраванай тэрыторыі і лёс мірнага насельніцтва. Аўтары паступова адыходзяць ад прадметна-сімвалічнага фону, характэрнага для 1941 г., і пачынаюць уключаць у сюжэт даставерны баявы эпізод. Напрыклад, былі выпушчаны плакаты, прысвечаныя подзвігу М. Гастэлы, Л. Даватара, В. Талаліхіна і многіх іншых. Кожны з іх суправаджаўся тэкстам аб сутнасці подзвігу ці нават вершамі. Героямі плакатаў станавіліся прадстаўнікі ўсіх родаў войск, многія з іх сустрэлі Перамогу, а некаторыя сілаю мастацкага таленту прадаўжалі жыць і пасля геройскай гібелі. Напрыклад, на плакаце «Дойдем до Берлина!» размешчана выява Героя Савецкага Саюза В. Голасава, які загінуў у баі пад Харкавам у 1943 г., аднак стаў сімвалам згаданага плаката, а потым яшчэ аднаго – «Красной Армии – слава!».

Значную частку калекцыі складаюць плакаты сатырычнага зместу. Прызнанымі майстрамі гэтага жанру былі Кукрыніксы, А. Канеўскі, В. Дэні і інш. Як прыклад, плакат В. Дэні «На Москву! Хох! От Москвы: ох!» (1941).




РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ




У кожнага салдата балела душа, калі ён бачыў плакаты, якія апавядалі аб жыцці на акупіраванай ворагам тэрыторыі і ў фашысцкай няволі. Многія з іх не маглі знаць, што сталася з іх блізкімі, якія апынуліся ў акупацыі, і таму сюжэт гэтых плакатных лістоў быў такім балючым і блізкім. Пасля таго, як Чырвоная армія ўступіла на тэрыторыю Украіны і Беларусі, тое, што было вобразна паказана, набыло рэальнае ўвасабленне і ад гэтага стала больш цяжэй.

Наступная буйная сюжэтная лінія плакатаў – дапамога фронту. Як своеасаблівы адказ на заклік плаката Д. Маора «Ты чем помог фронту?» можна разглядаць плакат П. Мальцава.




Дастатковая колькасць плакатаў з калекцыі музея прысвечана партызанскаму руху. Яны як бы дапаўняюць загалоўны плакат гэтай серыі «От народной мести не уйти врагу!». Па змесце іх можна падзяліць на інфармацыйныя, агітацыйныя, нават апавядальныя. Ёсць у калекцыі музея і ўнікальны плакат на палатне «Партизаны Могилевской области уничтожили на 1 мая 1944 г. …» (с. 14). Аўтар яго Аляксандр (Зосім) Шкляр – былы баец 100-й стралковай дывізіі, якая 26–28 чэрвеня 1941 г. абараняла падыходы да Мінска ў раёне Астрашыцкага Гарадка. Потым А. Шкляр змагаўся ў радах 277-га партызанскага палка ў Магілёўскай вобласці, меў баявыя ўзнагароды. Плакат выкананы ў адзіным экзэмпляры на палатне памерам амаль метр на паўтара. Змест плаката зразумелы, аднак гісторыя яго з’яўлення малавядома, таму сцвярджаць, наколькі прыведзеныя лічбы адпавядаюць рэчаіснасці і адкуль яны ўзяты – складана.




Падсумоўваючы сказанае, лічым патрэбным звярнуць увагу, што плакаты ваенных гадоў адлюстроўваюць не толькі падзеі на фронце, у савецкім і варожым тыле, але і змест тагачаснага мыслення і настрояў грамадства. Абсалютна недапушчальна экстрапаліраваць сучасныя падыходы і ацэнку падзей Вялікай Айчыннай вайны на тагачаснае грамадства, якое знаходзілася ў экстрэмальных умовах і ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ




большасці сваёй змагалася і спадзявалася на перамогу над ворагам. Ідэя, змест кожнага плаката былі зразумелы і салдатам, і партызанам, і працаўнікам тылу.

Спецыфічнымі сродкамі плакаты змагаліся за перамогу над страшным ворагам. І гэта вельмі выразна прасочваецца пры аналізе калекцыі ваенных плакатаў Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны, хаця, безумоўна, яна далёка не поўная. Нам падаецца, што асноўныя падзеі вайны, якія зафіксаваны мастацкімі сродкамі, дапаўняюць калектыўную памяць і ствараюць своеасаблівы ілюстрацыйны рад падзей Вялікай Айчыннай вайны.

1. *Голубович, А. Г.* Искусство социально-политического плаката Беларуси XX века (эволюция, стилистика и тематика) : автореф. дис. … канд. искусств. : 17.00.04 / А. Г. Голубович ; Белорус. гос. акад. искусств. – Минск, 2013. – 27 с.

2. *Емельянчык, У.* Паланэз для касінераў / У. Емельянчык. – Мінск : Беларусь, 1994. – 159 с.

3. Родина-мать зовет! Плакаты Великой Отечественной войны : каталог коллекции Белорус. гос. музея истории Великой Отечественной войны / сост. Г. В. Павловская. – Минск : Літаратура і мастацтва, 2010. – 218 с.

*M. BYASPALAYA*

**POSTERS COLLECTION OF THE BELARUSIAN STATE MUSEUM OF THE HISTORY OF THE GREAT PATRIOTIC WAR AS A SOURSE OF THE MEMORY ABOUT THE WAR**

*The main aim of the article is the reflection of the connection of verbal and visual information of the poster with the main events of the Great Patriotic War. Based on the analysis of poster collections of the Belarusian State Museum of the History of the Great Patriotic War the author shows the evolution of the basic ideas and its artistic representation, the relevance of the poster content to the corresponding events of the war.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 10.03.2014.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ